К@нтыненты

ГАЛОДНЫЯ ГУЛЬНІ

Да чаго прывядзе глабальны недахоп харчавання?

Засуха, крызіс, які выкліканы пандэміяй, а таксама сітуацыя ва Украіне пагражаюць пагоршыць і без таго складаную сітуацыю з голадам па ўсім свеце. Пра гэта газеце «Bild am Sonntag» расказала міністр па пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця ФРГ Свення Шульцэ. Яна адзначыла, што «цэны на прадукты ва ўсім свеце выраслі на траціну і знаходзяцца на рэкордным узроўні». «Сусветная харчовая праграма мяркуе, што 300 мільёнаў чалавек у свеце пакутуюць ад голаду, і гэтыя ацэнкі ўвесь час карэкціруюцца ў бок павелічэння. Пасыл такі: нам пагражае наймацнейшы голад з часоў Другой сусветнай вайны і мільёны ахвяр», — заявіла Свення Шульцэ. Як заўважаюць эксперты, на стан глабальнай харчовай бяспекі негатыўна паўплывала і бязглуздая санкцыйная палітыка Захаду. Да чаго прывядзе недахоп харчавання?

ФАКТАР НЕСТАБІЛЬНАСЦІ

Пасля пачатку пандэміі каранавіруса і звязанага з яе наступствамі разрыву лагістычных ланцужкоў многія краіны сутыкнуліся з праблемамі харчовай бяспекі. Магчымы крызіс гэтай сферы сёння выступае адным з ключавых фактараў глабальнай нестабільнасці. «Новыя неспрыяльныя з'явы ў забеспячэнні харчовай бяспекі, якія адзначаюцца апошнім часам, спрыяюць таму, што гэтая тэма становіцца актуальным міжнародным трэндам. У медыясферы ўсё часцей з'яўляюцца публікацыі пра глабальны голад і абвастрэнне канкурэнцыі на сусветных харчовых рынках», — сказаў начальнік аддзела Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Антон Дударонак, паведаміла БелТА. Паводле яго слоў, у 2020—2021 гадах былі адзначаны засуха ў многіх рэгіёнах планеты і рэзкае павышэнне цэн на газ, што садзейнічала росту кошту ўгнаенняў і іншых вытворчых затрат. Да дэфіцыту мінеральных угнаенняў прывяла і санкцыйная палітыка Захаду — трывогу б'юць буйныя сельгасвытворцы, у тым ліку Бразілія і самі Злучаныя Штаты.

«З улікам працэсаў і новых геапалітычных выклікаў, якія адбываюцца сёння, прагназуецца верагоднасць голаду для шэрагу рэгіёнаў планеты. Як мяркуюць эксперты, пад найбольшымі рызыкамі знаходзіцца Афрыка на поўдзень ад Сахары, дзе, паводле звестак Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН, на красавік бягучага года колькасць тых, хто галадае, з 2019 года вырасла на 46 мільёнаў, дасягнуўшы 282 мільёнаў чалавек. СМІ адзначаюць, што за апошнія паўтара года цэны на ўгнаенні ў краінах Афрыкі выраслі ўтрая. Па ацэнках даследчай групы AfricaFertilizer.Org, апублікаваных сёлета ў студзені, патэнцыйна гэта можа скараціць вытворчасць збожжавых на 30 мільёнаў тон (такой колькасці хопіць, каб накарміць 100 мільёнаў чалавек)», — распавёў Антон Дударонак.

БУНТЫ І НАЦЫЯНАЛІЗМ

Новы буйны эканамічны і сацыяльна-палітычны крызіс у краінах Чорнага кантынента можа прывесці да чарговай хвалі міграцыі на поўнач і дэстабілізацыі Еўрапейскага саюза. «Наступствы канфлікту Расіі і Захаду ва Украіне яшчэ больш абвастраюць рызыкі для харчовай бяспекі, улічваючы істотны ўклад як расійскага, так і ўкраінскага боку ў забеспячэнне стабільнасці глабальнай харчовай сістэмы (паводле ацэнак, абедзве дзяржавы вырабляюць амаль трэць агульнасусветнага аб'ёму пшаніцы і ячменю, 20 працэнтаў кукурузы і больш за палову сланечнікавага алею). Як адзначаюць эксперты, больш за траціну імпартаванай 45 найменш эканамічна развітымі краінамі Афрыкі пшаніцы расце на расійскіх і ўкраінскіх палях. У Заходняй Еўропе 35—40 працэнтаў працэнтаў сланечнікавага алею мае ўкраінскае і расійскае паходжанне», — паведаміў аналітык.

У сваю чаргу, заходнія абмежаванні адносна беларускіх і расійскіх вытворцаў угнаенняў, у тым ліку блакіроўка шэрагу традыцыйных гандлёва-транспартных маршрутаў, звужаюць магчымасці паставак калійнай прадукцыі на сусветныя рынкі, а створаны штучна дэфіцыт аўтаматычна садзейнічае росту яе кошту. Па словах начальніка аддзела БІСД, варта ўлічваць, што Расія з'яўляецца ключавым сусветным гульцом у здабычы прыроднага газу, які служыць сыравінай для вытворчасці ўгнаенняў.

У сувязі з гэтым генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш заявіў, што канфлікт ва Украіне можа выклікаць «ураган голаду і крах глабальнай харчовай сістэмы» па ўсім свеце. На думку кіраўніка Сусветнай гандлёвай арганізацыі Нгозі Аконджа-Івеала, вайна і санкцыі могуць справакаваць галодныя бунты ў найбяднейшых краінах: «Ежа і энергарэсурсы — два самыя вялікія артыкулы расходаў у спажывецкім кошыку бедных людзей ва ўсім свеце». Як адзначае брытанская Financial Times, працяг санкцый створыць палітычныя рызыкі і для кіраўніцтва заходніх краін, можа дэстабілізаваць і раскалоць краіны Захаду: «Да восені 2022 года тэма Украіны можа адысці на другі план, а эканамічны крызіс стане дамінантай у заходняй палітыцы».

Сучаснаму свету пагражае новая халодная вайна з ядзерным адценнем і выбухным ростам крайняга нацыяналізму. Такое меркаванне выказаў кіраўнік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Антоніу Гутэрыш падчас свайго выступлення ў амерыканскім універсітэце Сэтан-Хол у Нью-Джэрсі, паведаміла ТАСС. Паводле слоў генсека ААН, перад чалавецтвам сёння стаіць нямала выклікаў. Яны дэманструюць раскол, які адбыўся ў нашым грамадстве. Гутэрыш таксама адзначыў, што ў свеце ёсць і іншыя праблемы, звязаныя з глабальным пацяпленнем, ростам няроўнасці, голадам і хваробамі. Звяртаючыся да студэнтаў універсітэта, генеральны сакратар ААН папярэдзіў, што яны ўступаюць у свет, поўны небяспек. Падобнай напружанасці, як зараз, не было дзесяцігоддзямі.

100 МІЛЬЁНАЎ БЕЖАНЦАЎ

Тым часам стала вядома, што колькасць бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб упершыню за ўсю гісторыю назіранняў перавысіла ў свеце 100 мільёнаў чалавек. Аб гэтым заявілі ва Упраўленні вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН). «100 млн — суровая лічба, выцвярэжальная і трывожная ў роўнай меры. Гэта рэкорд, які ніколі не павінен быў быць устаноўлены», — сказаў вярхоўны камісар ААН па справах бежанцаў Філіпа Грандзі, дадаўшы, што гэта мусіць паслужыць трывожным сігналам для чалавецтва. Ён таксама адзначыў, што гуманітарная дапамога з'яўляецца паліятывам, а не лекамі. Паводле яго слоў, каб змяніць тэндэнцыю, трэба дабіцца ўстанаўлення міру і стабільнасці. Па даных УВКБ ААН, да канца мінулага года колькасць вымушана перамешчаных асоб ва ўсім свеце вырасла да 90 мільёнаў чалавек, што было звязана з новымі хвалямі гвалту і зацяжнымі канфліктамі ў такіх краінах, як Эфіопія, Буркіна-Фасо, М'янма, Нігерыя, Афганістан і Дэмакратычная Рэспубліка Конга.

Магчымае наступленне голаду ў краінах Блізкага Усходу і Афрыкі непазбежна выкліча рост колькасці вымушаных перасяленцаў, якія будуць рухацца ў напрамку Еўропы, а яна ўжо прыняла бежанцаў з Украіны. Гэта можа рэзка пагоршыць сітуацыю ў Еўропе, і без таго ахопленую эканамічным крызісам, справакаваным падаражаннем энерганосьбітаў. «Каму ж патрэбна такая сітуацыя ў свеце? Хто можа паспрабаваць атрымаць выгаду з голаду, які пагражае планеце? Хутчэй за ўсё, у гэтым зацікаўлены Злучаныя Штаты. Паслабленне эканомікі Еўрапейскага саюза выгадна для Вашынгтона. Гэта дазволіць значна знізіць самастойнасць краін, якія ўваходзяць у ЕС, каб канчаткова ператварыць яго ў інструмент для правядзення сваёй палітыкі на еўрапейскім кантыненце», — адзначыў Baltnews.

ЗНЯЦЬ АБМЕЖАВАННІ

На гэтым фоне Сусветны банк, Міжнародны валютны фонд, Сусветная гандлёвая арганізацыя і Сусветная харчовая праграма ААН яшчэ ў сярэдзіне красавіка запатрабавалі, каб сусветная супольнасць неадкладна прыняла меры для прадухілення голаду. У сумеснай заяве гэтых арганізацый падкрэсліваецца, што ўкраінскі крызіс пагоршыў наступствы пандэміі, якая працягваецца ўжо трэці год. «Рэзкае павышэнне цэн на асноўныя прадукты харчавання і недахоп паставак узмацнілі ціск на хатнія гаспадаркі ва ўсім свеце і прыводзяць яшчэ мільёны людзей да беднасці», — адзначаецца ў паведамленні.

Арганізацыі таксама заклікалі не ўводзіць эмбарга на пастаўкі прадуктаў харчавання і ўгнаенняў, а таксама падтрымаць рэгіёны, якія маюць у гэтым патрэбу: неабходна прадугледзець экстраннае забеспячэнне харчаваннем і фінансавую дапамогу. Сусветнай супольнасці трэба нарасціць сельскагаспадарчую вытворчасць і аб'ём адкрытага гандлю, вынікае з заявы.

НОВАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ

Цяперашняя сітуацыя стварае комплекс цяжка вырашальных праблем, з якімі могуць сутыкнуцца краіны свету. Зрыў ланцужкоў паставак можа спарадзіць дэфіцыт харчовых тавараў, што пагоршыць праблему інфляцыі. Ва ўмовах бягучай нявызначанасці перад імпарцёрамі ў Еўропе, Паўночнай Афрыцы і Кітаі стаіць задача пошуку шляхоў забеспячэння дастатковых паставак. «Сёння мы бачым, як геапалітычныя фактары ўсё больш мяняюцца і фарміруюць новую рэальнасць. Так, першачарговай задачай аналітыкаў ЗША цяпер з'яўляецца не столькі пралічванне эканамічных наступстваў крытычнага недахопу харчавання, колькі прагназаванне магчымых сцэнарыяў выкарыстання Расіяй падкантрольных харчовых рэсурсаў у геапалітычных мэтах», — падкрэсліў Антон Дударонак.

У гэтых умовах намаганні Вашынгтона могуць быць сканцэнтраваны ў першую чаргу на дэстабілізацыі адносін паміж Расіяй і Кітаем, пераарыентацыі паставак харчавання на краіны, якія найбольш залежаць ад экспарту ўкраінскага збожжа для зніжэння ўплыву на іх РФ (Інданезію, Філіпіны, В'етнам, Малайзію, Тайланд, Егіпет, Марока), а таксама перашкаджэнні планам Расіі па дыверсіфікацыі ланцужкоў паставак. «Такім чынам, нараўне з пандэміяй і праблемамі змены клімату, канфлікт ва Украіне ў сярэднетэрміновай перспектыве можа ўзмацніць харчовую нестабільнасць. У глабальным эканамічным вымярэнні ён таксама здольны прывесці да трансфармацыі міжнародных арганізацый і эканамічных сістэм, узмацнення ролі лічбавых валют, паслаблення долара, з'яўлення новых рэзервовых валют», — звярнуў увагу Антон Дударонак.

Разам з тым у існуючых умовах новыя магчымасці для росту атрымліваюць дзяржавы, якія маюць актывы ў сектары сельскай гаспадаркі, уключаючы пастаўкі сельскагаспадарчай тэхнікі і ўгнаенняў, мяса-малочную вытворчасць, зямельныя рэсурсы. «У гэтых адносінах Беларусь і Расія займаюць устойлівыя пазіцыі. Кітайска-расійскія пагадненні ў галіне сельскай гаспадаркі і энерганосьбітаў сфарміравалі надзейную абарону ад негатыўнага ўздзеяння заходніх санкцый. Беларусь таксама падышла да магчымага харчовага дэфіцыту з уласнай мадэллю забеспячэння харчовай бяспекі. Паводле даных The Economist на 2021 год, па індэксе сусветнай харчовай бяспекі Беларусь займае 36-е месца», — акцэнтаваў увагу аналітык. У нашай краіны напрацаваны партнёрскія адносіны з многімі рэгіёнамі планеты, ёсць сувязі як з традыцыйнымі, так і новымі рынкамі. «Можна з упэўненасцю заключыць, што нашы краіны маюць несумненны і шырокі патэнцыял для ўзаемадзеяння ў гэтай галіне», — заўважыў эксперт.

Захар БУРАК.

❍ **Даслоўна**

«АГУЛЬНАЯ ЗАДАЧА»

Пасланне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на мінулым тыдні было перададзена генеральнаму сакратару ААН. Гэта адбылося падчас сустрэчы пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры ААН Валянціна Рыбакова з Антоніу Гутэрышам, паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі. «Ва ўмовах глабальнай узаемазалежнасці немагчыма забяспечыць харчовую бяспеку і чыстае навакольнае асяроддзе, процідзейнічаць пандэміям або змененню клімату ў сваім асобным кутку без усеагульных шматбаковых намаганняў, — адзначаецца ў Пасланні беларускага лідара. — Канфлікт ва Украіне, яго першапрычыны і бягучыя санкцыі Захаду супраць Расіі ўжо нясуць свету свае разбуральныя наступствы і выяўляюцца ў розных рэгіёнах у выглядзе небывалага росту цэн на прадукты харчавання, энерганосьбіты, угнаенні, паветраныя і марскія перавозкі, зніжэнне дапамогі краінам, якія асабліва маюць у ёй патрэбу, у Афрыцы, Азіі і на Блізкім Усходзе. Усё гэта пагражае голадам, спадам узроўню жыцця, абвастрэннем эканамічнай і сацыяльнай напружанасці, перш за ўсё ў найменш развітых краінах, і ў комплексе можа вызваць новую хвалю масавай міграцыі».

У Нур-Султане паказалі фільм пра беларускага партызана

Сёння кожная кінематаграфічная падзея прыцягвае надзвычайную ўвагу. Не так часта здымаюцца новыя сур'ёзныя фільмы, звязаныя з гісторыяй на постсавецкай прасторы. Тым болей уражлівым падаецца зварот да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Упершыню за мінулыя 35 гадоў казахстанскія кінематаграфісты звярнуліся да тэмы Вялікай Айчыннай вайны.

У Нур-Султане, сталіцы Казахстана, прайшоў закрыты паказ мастацкага фільма «Лета 1941 года» рэжысёра Бекбулата Шэкерава. У цэнтры ўвагі — лёс казахстанскага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, віцэ-прэм'ера ўрада Казахскай ССР, літаратуразнаўца, празаіка Адзія Шарыпава. Мастацкі аповед расказвае пра рэальную гісторыю чалавека: ад першага бою казаха-чырвонаармейца да трагічнага ранення. Болей чым два гады Адзій Шарыпаў быў партызанам у беларускіх лясах, яго добра ведалі як Сашку-казаха.

Удзел у закрытым паказе прынялі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан Павел Уцюпін, удава Адзія Шарыпава — Клара Шарыпава, казахстанскі літаратуразнаўца Святлана Ананьева, якая добра вядомая і ў Беларусі і ў Казахстане як генератар многіх грамадскіх, культурных, навуковых казахстанска-беларускіх ініцыятыў.

Вытокі фільма пра беларускага партызана і слаўнага сына казахскага народа — у 2014 годзе, калі кінарэжысёр Бекбулат Шэкераў пазнаёміўся з Клаўдзіяй Шарыпавай, якая і праз дзесяцігоддзі самым сур'ёзным чынам захоўвае памяць пра свайго мужа і легендарнага чалавека. У фільме ёсць усё: і мужнасць, і адвага, і смеласць, і здрадніцтва, і любоў... А самае галоўнае (і пра гэта гаварылі пасля прагляду фільма «Лета 1941 года» літаральна ўсе) — такія кінакарціны выконваюць важкую выхаваўчую, ідэалагічную ролю. Яны, расказваючы пра вайну, выступаюць супраць вайны. Асноўная частка здымак фільма была праведзена ў Беларусі. Галоўную ролю ў кінакарціне выканаў расійскі акцёр, казах па нацыянальнасці Азамат Нігманаў.

— Як на мой погляд, — каментуе падзею кандыдат філалагічных навук Святлана Ананьева, — кінафільм «Лета 1941 года» лагічна дапаўняе цэласны партрэт нашага суайчынніка, вялікага інтэрнацыяналіста, вучонага і дзяржаўнага дзеяча Адзія Шарыпава. Мне неаднойчы даводзілася расказваць пра славутага казахстанца ў розных аўдыторыях, на розных навукова-практычных канферэнцыях, форумах не толькі ў Алматы і Нур-Султане, але і ў Мінску, Гродне, іншых гарадах Беларусі. Спадзяюся, што гэты па-свойму ўнікальны фільм добра прымуць гледачы і Казахстана, і Беларусі. Асабліва важна, каб кінакарціну праглядзелі школьнікі, моладзь нашых краін. Сустрэча з героямі фільма, а значыць, з сапраўднымі героямі Вялікай Айчыннай вайны, стане добрым урокам выхавання патрыятычных пачуццяў, выхавання гонару за сваіх гераічных прашчураў.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Даты Падзеі Людзі

28 МАЯ

У краіне

1850 год — нарадзіўся (в. Чарнін, цяпер у Светлагорскім раёне) Аляксандр Нікіфаравіч Шыманоўскі, беларускі этнограф і фальклярыст. Аўтар рукапіснага зборніка «Минская губерния и ее народное творчество в связи с описанием праздников и обрядов» (захаваўся ў архіве Рускага геаграфічнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу), у якім сабраны каштоўны матэрыял па беларускай фальклярыстыцы і этнаграфіі, выкладзены яго погляды на народную творчасць. У зборнік уключаны бытавыя, салдацкія, гістарычныя і іншыя песні, казкі, загадкі, прымаўкі, гаспадарча-этнаграфічныя назвы.

1917 год — нарадзілася (Балгарыя) Лілія Карастаянава, удзельніца партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1938 года працавала ў рэдакцыі газеты «Комсомольская правда». З лістапада 1942 года ў партызанскіх атрадах на Браншчыне і ў Беларусі. Пісала артыкулы, нарысы карэспандэнцыі аб баявых буднях партызан, заклікала насельніцтва да барацьбы з фашыстамі. Разам з байцамі беларускіх партызанскіх атрадаў імя М. Калініна і імя В. Чапаева не раз удзельнічала ў баявых аперацыях. Загінула ў баі ў 1943 годзе. Імем Л. Карастаянавай названы вуліцы ў Мінску, Гомелі.

1937 год — нарадзіўся (г. Мінск) Генрых Яўгенавіч Ціхановіч, беларускі мастак. Аўтар карцін «Мірная раніца», «Не спі, Радзіма!», «Памяці сына», партрэтаў «Францыск Скарына», «Я. Купала. Сорак першы», лірычных пейзажаў, экслібрысаў.

У свеце

1830 год — прэзідэнт ЗША Эндру Джэксан падпісаў Закон аб перасяленні індзейцаў, які дазваляў выгнанне індзейцаў з іх земляў і адмаўляў ім ва ўсіх грамадзянскіх правах і свабодах на тэрыторыі на ўсход ад Місісіпі. Выгнанне пачалося ў 1831 годзе; некаторыя індзейскія плямёны паўсталі, некаторыя спрабавалі пратэставаць законным шляхам і звярнуліся ў вышэйшы федэральны суд, які, аднак, пацвердзіў, што яны не з'яўляюцца грамадзянамі ЗША і таму не абаронены Канстытуцыяй.

1871 год — пасля тыдня крывавых баёў разгромлена Парыжская камуна. Падчас баёў і пакаранняў смерцю загінулі 25 тысяч камунараў, каля 40 тысяч былі кінуты ў турмы або высланы на катаржныя работы ў Новую Каледонію і Алжыр.

1877 год — нарадзіўся Максіміліян Аляксандравіч Валошын, рускі паэт, крытык, мастак, перакладчык. Выступаў у друку з 1895 года. Належаў да сімвалістаў, супрацоўнічаў у іх часопісе «Весы», «Золотое руно» і інш. Вядомы і як мастак, акварэліст.

1987 год — Маціяс Руст, 19-гадовы пілот-аматар з нямецкага мястэчка Ведэль пад Гамбургам, нейкім чынам мінуўшы савецкія сістэмы СПА, прызямліўся на спартыўным самалёце ў цэнтры Масквы на Васільеўскім спуску, побач з Крамлём. У вышэйшых эшалонах савецкіх Узброеных Сіл быў зроблены шэраг замен, у прыватнасці адпраўлены ў адстаўку міністр абароны Маршал Савецкага Саюза С. Л. Сакалоў.

Так гаварыў...

АНАРЭ ДЭ БАЛЬЗАК:

«Скупасць пачынаецца там, дзе канчаецца беднасць».

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Добры тыдзень для шпацыраў, пачатку вандроўкі, знаёмства з новымі людзьмі і разнастайнымі галінамі ведаў. Праявіце такія якасці, як рашучасць і актыўнасць, і гэта не застанецца незаўважаным. Аказвайце падтрымку толькі тым, хто для вас сапраўды важны і цікавы, паспрабуйце не марнаваць сілы дарма. У сераду мітусня і клопаты могуць аказацца карыснымі і прынесці нечаканы вынік. У выхадныя пастарайцеся быць больш уважлівымі і паблажлівымі да блізкіх людзей, прабачце ім іх маленькія недахопы і слабасці.

ЦЯЛЕЦ. На рабоце і з дзелавымі партнёрамі паспрабуйце паводзіць сябе больш стрымана, пазбягайце негатыўных эмоцый. Гаварыце спакойна і па сутнасці, нават калі вы выявілі нечыя карыслівыя інтарэсы. Лепш накіруйце свае сілы і энергію на наладжванне новых дзелавых сувязяў. У чацвер начальства адзначыць вашу мэтанакіраванасць і дзелавую хватку, напэўна, задумаецца пра заахвочванне. У выхадныя ў сям'і вас чакаюць спакой і дабрабыт. Зоркі запэўніваюць, што найбольш спрыяльным днём будзе нядзеля.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні трэба заняцца выкананнем даўняй мары. Сам лёс дапаможа дабіцца жаданага. Плануйце важныя сустрэчы і перамовы на сярэдзіну тыдня. Чым больш актыўнымі будзеце, тым большага поспеху дасягнеце. Падзеі чацвярга дазволяць набыць каштоўны практычны досвед. Калі ў чымсьці будзеце сумнявацца, не саромейцеся задаць пытанне. Вас чакае поспех у справах і каханні.

РАК. Можаце сутыкнуцца з неабходнасцю прыняць рашэнне і завершыць тэрміновыя справы. З'явіцца дадатковая нагрузка, а засяродзіцца стане цяжэй. Не саромейцеся папрасіць дапамогі ў калег ці сяброў. Найлепшым выхадам было б увогуле дэлегаваць усю адказнасць камунебудзь, а самому прысвяціць тыдзень адпачынку. Калі гэта ўсяго толькі мара, паспрабуйце хоць бы пабольш спаць. У суботу не будзьце залішне самаўпэўненыя, гэта пагражае прывесці да ўскладнення адносін з навакольнымі.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні верагодныя перамены, якія станоўча паўплываюць на многія сферы вашага жыцця, магчымы нават пераезд на новае месца жыхарства, выкліканы новымі прафесійнымі абавязкамі. Цяпер добра зрабіць генеральную прыборку і выкінуць хлам, які вас раздражняе. І адразу адчуеце сябе лепш. Субота — добры дзень для ачышчэння ад усяго лішняга, аджылага. Гэта датычыцца і асабістых адносін.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні можаце здзейсніць прарыў да новых вышынь у кар'еры. Дапамога сяброў і калег стане вельмі важнай. Засяродзьцеся на працы, яна вам проста неабходна, поспех падыме самаацэнку. Паспрабуйце быць больш цярплівымі да нязначных недахопаў навакольных, інакш вашы пастаянныя прыдзіркі па дробязях пагражаюць раззлаваць каго заўгодна. У пятніцу арганізуйце сустрэчу з сябрамі або пікнік на дачы.

ШАЛІ. Вас можа чакаць тыдзень разважанняў і аналізу. Назапасіліся праблемы, але вы зможаце шмат што вырашыць у найбліжэйшыя дні. Не падпускайце да сябе нуду і засмучэнне, яны хутка сыдуць, бо падзеі, якія адбываюцца з вамі, будуць вельмі пазітыўныя. У панядзелак звярніцеся з просьбай да начальства, і, калі яна будзе рэальнай, яе выканаюць. У сераду падзеі парадуюць і ад тужлівага настрою не застанецца і следу. У чацвер удалыя паездкі і камандзіроўкі. Гэты дзень добры для разбурэння старога і стварэння новага. У выхадныя запрасіце да сябе сяброў ці сваякоў і кампенсуйце недахоп зносін.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні можна ўпэўнена прыступаць да кардынальнай змены свайго жыцця. Пазбаўцеся ад таго, што замінае і раздражняе. Больш майце зносіны з каханым, гэта натхніць вас на подзвігі. Праца прынясе поспех і прыбытак. Самы час аб'явіць услых пра свае добрыя якасці і заслугі. Не забывайце пра блізкіх, ім неабходна ваша ўвага.

СТРАЛЕЦ. У панядзелак верагодная цікавая дзелавая паездка, якая дасць магчымасць пашырыць кола зносін і адкрые новыя перспектывы. Паспрабуйце вучыцца слухаць і чуць навакольных — вы адкрыеце для сябе шмат цікавага і станеце мудрэйшымі. Магчымы кар'ерны ўзлёт. Паспрабуйце па-філасофску паставіцца да ўнутранага напружання, яно стане толькі пабочным эфектам сабранасці, якая спатрэбіцца для дасягнення важных мэт.

КАЗЯРООГ. На гэтым тыдні чакаюцца разнастайныя падзеі і сустрэчы, якія пагражаюць вас стаміць. Будзьце ўважлівыя, размяркоўваючы сілы і час, якія спатрэбяцца не толькі на працы, але і дома. У чацвер не выключаны непаразуменні і канфлікты, паколькі вашы інтарэсы могуць крыху разыходзіцца з інтарэсамі партнёраў. На наступны дзень, праявіўшы разважнасць, вы дасягняце з імі жаданага кампрамісу. У нядзелю будзьце гатовыя выдаткаваць свой час на блізкіх.

ВАДАЛІЎ. Пэўна, некаторыя вашы погляды злёгку састарэлі — не варта за іх чапляцца, збярыцеся з сіламі, змяніцеся. Навучыцеся лунаць над сітуацыяй, гэта шлях да поспеху. У выхадныя можаце разлічваць на змены ў вашым уласным доме. Нарэшце вы дасягняце паразумення са сваякамі.

РЫБЫ. Добры час, каб праводзіць яго ў водпуску на моры. Ну а калі пакуль давядзецца працаваць, паспрабуйце кантраляваць свае эмоцыі, бо можаце быць залішне запальчывыя і нават агрэсіўныя. І гэта пагражае праблемамі. Таксама не варта хлусіць блізкім, усё таемнае стане відавочным. У выхадныя вам проста неабходна сур'ёзна заняцца хатнімі справамі.

УСМІХНЕМСЯ

Як троліць мажораў:

— Ды ты хоць ведаеш, хто мой бацька?!

— А што, твая маці табе не сказала?

І ў ДАІ з'ездзіў, і па запчасткі, і заправіўся. Не магу зразумець, як бы я паспеў усё гэта без машыны.

Калі ў вас устаноўлены двухтарыфны лічыльнік электраэнергіі, то карыстацца перфаратарам лепш уночы — так танней.

— Добры дзень, у мяне вось руль рыпае, калі паварочваю. Што гэта?

Афіцыйны дылер: «Рулявая рэйка, кошт 3000, са зніжкай 2000, замена 600, але гарантыі, што рыпанне знікне, не даём».

Сэрвіс сярэдняй саматужнасці: «Рулявы кардан, стык з рулявой рэйкай, кошт 1000, работа 400».

Механік Васіль: «Ды вось тут у цябе кардан сыходзіць у купал гумовы паміж маторам і салонам, пагнуўся. Сіліконам папырскаць трэба, бясплатна зраблю».

Перад тым, як легчы спаць, усведамляйце, што вы — два кілаграмы мозга, які кіруе кавалкам мяса.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.49	21.26	16.37
Віцебск	4.31	21.23	16.52
Магілёў	4.39	21.16	16.37
Гомель	4.44	21.04	16.20
Гродна	5.06	21.40	16.34
Брэст	5.15	21.32	16.17

Месяц

Апошняя квадра 22 мая. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Дзмітрыя, Ісая, Макара, Пахома.*

К. *Інгі, Эміліі, Аўгусціна, Вільгельма, Германа, Яраміра.*

ЗАЎТРА



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1234.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 мая 2022 года.